# Мікола Шабовіч



Кожны з нас прыпасае Радзімы куток,
Каб да старасці чэрпаць адтуль успаміны...
*Пімен Панчанка.*

* * *

Хоць не бачыў чужых я краін,
Мне і сёння па-школьнаму дзіўна,
Што мой край нарачанскіх рабін
Я малой называю радзімай.

А прыгледзецца лепей калі,
Тут усё мне вялікае змалку:
І ў блакіце вясны жураўлі,
І буслы, і на ліпе буслянка.

Тая вулка, што звала здалёк
З гарадоў, немалых і багатых,
*І стракаты*[1], *як сон, матылёк*,
І сябры, і бацькоўская хата.

Назавіце сродкі мастацкай выразнасці, з дапамогай якіх створаны вобраз у выдзеленых паэтычных радках.

І павага чыясь, і любоў,
І пачуцці, і радасць, і мроі...
Край рабін, край азёр, край буслоў,
Я і ў будні, і ў святы з табою.

? 1. З якімі вобразамі звязана для Міколы Шабовіча яго малая радзіма? З якім пачуццём ён апісаў яе?

[1] *Страка́ты* — тут: з рознакаляровымі плямамі.



Правообладатель Национальный институт образования

2. Назавіце сродкі мастацкай выразнасці, якія дапамагаюць перадаць аўтарскія адносіны да краю «нарачанскіх рабін»: метафары — «вулка звала», ...; шматзлучнікавасць — «і сябры, і бацькоўская хата», «і ў будні, і ў святы», ...; паўторы — ...; параўнанні — ... .
3. Для адлюстравання малой радзімы паэт выкарыстаў апісальныя звароты[1] «край нарачанскіх рабін», «край азёр, край буслоў», у якіх называюцца характэрныя прыкметы роднай мясцовасці. Паспрабуйце і вы назваць апісальнымі зваротамі свой маленькі куточак радзімы.
4. Зачытайце радкі, у якіх заключана галоўная думка верша. Пракаменціруйце іх.
5. Чаму кожны чалавек па-асабліваму любіць тую мясціну, дзе ён нарадзіўся? Чаму ўсё яму тут даспадобы, усё здаецца адметным, раднейшым і прыгажэйшым?
6. Прадоўжыце пералік назваў нашай Радзімы: Беларусь, Белая Русь, Бацькаўшчына, Зямля пад белымі крыламі, мой чароўны беларускі край, мілы кут маіх дзядоў...
7. Лірычны герой верша Алеся Ставера «Жураўлі на Палессе ляцяць...» лічыць, што разлука ўзмацняе пачуццё любові да Радзімы: «Каб любіць Беларусь нашу мілую, // Трэба ў розных краях пабываць». Герой верша Міколы Шабовіча «Хоць не бачыў чужых я краін...» ніколі не пакідаў родную старонку. Ці паўплывала гэта на яго любоў да Бацькаўшчыны? Параўнайце пачуцці і эмоцыі лірычных герояў абодвух вершаў і намалюйце слоўны партрэт патрыёта сваёй Радзімы.
8. Якой вы бачыце малую радзіму? Выкарыстайце інтэрнэт для пошуку актуальнай і цікавай інфармацыі пра родныя мясціны, гісторыю раёна, горада, вёскі і інш., паходжанне назвы.
9. Падрыхтуйце вуснае сачыненне на тэму «Мне выпала шчасце тут нарадзіцца». Пачаць яго можна так: «Я люблю наш горад (вёску, вуліцу, дом), у якім нарадзіўся, расту і вучуся, гуляю ў двары ці гарадскім парку, атрымліваю асалоду ад усіх радасцей шчаслівага дзяцінства...».

---

[1] Гэты троп называецца *перыфразай*.



Правообладатель Национальный институт образования